**ВАСЮКОВІЧ ЛЮДМІЛА СЯРГЕЕЎНА**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта “МІТСО”

## ШКОЛЬНЫ ПАДРУЧНІК ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ

Прынцып пераемнасці навуковай тэорыі патрабуе аналізу аб’екта даследавання ў гістарычным аспекце, паколькі разгляд любой з’явы як “пэўнай канстанты, без спробы расчляніць яе на розных узроўнях станаўлення і тым самым па-за ідэяй развіцця з’яўляецца недахопам, які абмяжоўвае магчымасці даследчыка” [1, с. 124–125]. З улікам таго, што “новыя ідэі і канцэпцыі могуць разлічваць на трывалы поспех тады, калі абапіраюцца на ранейшыя культурна-педагагічныя набыткі” [2, с. 26], ***мэта артыкула*** наступная: асэнсаваць этапы, эвалюцыю саставу і структуры школьнага падручніка па беларускай мове. Зварот да гісторыі станаўлення выдання як аб’екта самастойнага даследавання дае мажлівасць усвядоміць дыялектычнасць ацэнак у поглядах на вучэбную кнігу, уразумець рухомы характар патрабаванняў да яе асноўных кампанентаў. Спасціжэнне пройдзенага шляху дае падставу ацэньваць падручнік не як вынік суб’ектыўнай дзейнасці складальнікаў, а бачыць у ім гістарычна-культурны феномен, матэрыяльны прадукт пэўнага перыяду ў развіцці філасофскай, лінгвістычнай, педагагічнай і метадычнай думкі. Рэтраспектыўны аналіз дае магчымасць прасачыць характар колькасна-якасных трансфармацый у змесце і структуры выдання.

Перыядызацыя развіцця беларускай лінгваметодыкі як тэарэтычная праблема атрымала вырашэнне ў фундаментальным выданні пад рэдакцыяй прафесара М.Г. Яленскага. Прапанаваная класіфікацыя ўтрымлівае тры навукова абгрунтаваныя этапы: 20–30-я, 40–80-я гады мінулага стагоддзя і канец ХХ – пачатак ХХІ стагоддзя, якія адпавядаюць перыядам станаўлення і развіцця методыкі беларускай мовы як навукі і адукацыйнай практыкі [3, с. 14]. Канкрэтызуем названыя перыяды ў кантэксце развіцця школьнага падручніка як аб’екта педагагічных даследаванняў, тэндэнцый у трансфармацыі зместу і структуры выдання. Дэталізуем гэтыя этапы, зыходзячы з набыткаў педагагічнай навукі ў плане распрацоўкі вучэбнага тэксту як асноўнага камапанента вучэбнай кнігі.

Метады даследавання. Выкарыстаны комплекс тэарэтычных і эмпірычных метадаў: *аналіз навуковай літаратуры, нарматыўных дакументаў,* што дазволіла сфармуляваць вядучыя паняцці і тэарэтычныя асновы артыкула; мадэляванне структуры вучэбнага тэксту школьных падручнікаў.

*Першы этап* – умоўна назавём яго датэкставым – (20-я гады ХХ ст. – 30-я гады ХХ ст.) пазначаны адукацыйнымі патрэбамі савецкай школы [4, с. 22]. Асноўнымі на гэты час былі школьныя падручнікі па беларускай мове, падрыхтаваныя Браніславам Тарашкевічам і Язэпам Лёсікам. “Беларуская граматыка” Б. Тарашкевіча (1918 год) вылучаецца як высокім навуковым узроўнем лінгвістычнай тэорыі, так і яе дыдактычным увасабленнем. Сам аўтар разумеў неабходнасць метадычных трансфармацый складанага лінгвістычнага матэрыялу: “Патрэбы школы прымусілі мяне адкінуць усё тое, што мела больш чыста навуковае значэнне, як практычнае. Я ўвесь час не выпускаў з вачэй педагагічную старану кніжкі” [5, с. 4]. “Граматыка” Б. Тарашкевіча прадвызначыла на дзесяцігоддзі наперад стабілізацыю граматычных, правапісных нормаў беларускай літаратурнай мовы, стварыла грунтоўную аснову для распрацоўкі лінгвістычнай тэорыі, сфарміравала будучы “правобраз” школьнага падручніка. Вопыт першых выданняў, дыдактычны практыцызм аўтараў дазволіў сфармуляваць шэраг патрабаванняў, якія ў гісторыі зменлівых поглядаў на школьны падручнік засталіся агульнапрызнанымі: навуковасць зместу; выхаваўчая скіраванасць матэрыялу; даступнасць; улік індывідуальных асаблівасцей вучняў; нагляднасць; сувязь тэарэтычнага і практычнага матэрыялу.

*Другі этап* у развіцці айчыннай лінгваметодыкі (1940–1980-я гады) характарызуецца ўдасканаленнем моўнай адукацыі, распрацоўкай новых вучэбных праграм і стабільных падручнікаў па беларускай мове. Этап пазначаны станаўленнем паняцця *вучэбны тэкст* у рэчышчы агульнай тэорыі школьнага падручніка. У гэты перыяд актыўна распрацоўваецца ідэя стабільнага падручніка. Развіццю ідэі спрыяла ўсталяванае ў методыцы прызнанне вучэбнай кнігі неад’емным кампанентам працэсу навучання. Педагагічная думка апрыёры сцвярджалася ў тым, што паляпшэнне выкладання мовы ў школах у многім залежыць ад высакаякасных падручнікаў.

Вядучым прынцыпам стварэння тэкстатэкі падручніка становіцца *тэматычны,* які дэклараваў прыярытэт зместавых характарыстык. Асноўнымі крытэрыямі пры адборы тэкстаў

прызнаваліся: інфармацыйная насычанасць і навізна матэрыялу, ступень яго даступнасці, выхаваўчая значнасць, стылістычная разнастайнасць, адлюстраванне міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей у навучанні. Вучэбныя тэксты падручнікаў арыентаваліся на каштоўнасці, абвешчаныя Камуністычнай партыяй і сацыялістычнай дзяржавай.

Значным для развіцця методыкі была распрацоўка Закона “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы адукацыі ў СССР” (1958 год), які запатрабаваў пошукаў новых шляхоў мадэрнізацыі педагагічнай сістэмы. У кантэксце распрацаванага дзяржаўнага дакумента была акрэслена як найактуальная праблема ўдасканалення вучэбных планаў і праграм, стварэння падручнікаў на прынцыпова новай аснове. У адпаведнасці з пастаўленай задачай калектыў у саставе У.К. Андрэенкі і М.С. Яўневіча падрыхтаваў новыя падручнікі: “Беларуская мова. Ч. 1. Фанетыка і правапіс. Марфалогія” (1963) і “Беларуская мова. Ч. II. Сінтаксіс і пунктуацыя” (1964). Аўтары акрэслівалі мэту сваёй працы наступным чынам: “Вучэбныя тэксты трэба падаваць у скарочаным выглядзе, без непатрэбнага паўтарэння некаторых з’яў, агульных для беларускай і рускай моў; па мажлівасці спрасціць правілы, даць лёгкія і дакладныя фармулёўкі; пашырыць і зрабіць разнастайнымі практыкаванні; даць больш практыкаванняў па развіцці мовы” [6, с. 36].

У школьных падручніках названага перыяду тэрмін *тэкст* з’яўляецца спарадычна, непаслядоўна. Тэрмін у сучасным разуменні пачынае ўжывацца ў школьных выданнях з 70-ых гадоў мінулага стагоддзя. Менавіта з гэтага часу пытанні тэксту актыўна даследуюцца на лінгвістычным узроўні. Актуалізуецца моўная прырода тэксту, апісанне яго граматычных прымет. Тэкст вызначаецца найперш як аб’ект лінгвістыкі, адзінка, што фарміруе найвышэйшы ўзровень мовы як сістэмы. На гэты перыяд прыпадае выхад аўтарытэтнага выдання – зборніка “Праблемы школьнага падручніка” (20 выпускаў), які з 1974 па 1991 год сістэматычна асвятляў шматлікія аспекты тэорыі і практыкі школьнай вучэбнай кнігі як масавага выдання.

Вылучаны перыяд адыграў вызначальную ролю ў станаўленні школьнага падручніка як самастойнага аб’екта даследавання. Пытанні тэксту разглядаліся спарадычна ў рэчышчы агульнай тэорыі падручніка. Для лінгвістычнай, педагагічнай і метадычнай навукі гэтага часу характэрна пэўная “размытасць”, абагульненасць паняцця *тэкст*, што знайшло адлюстраванне і ў школьных падручніках да сярэдзіны XX стагоддзя, у якіх адсутнічалі тэмы, звязаныя з вывучэннем тэксту. Тэрмін ужываўся непаслядоўна, часта замяняўся слозлучэннямі *вучэбны матэрыял, матэрыял для назіранняў, апавяданне, урывак* і г.д. У рамках тагачаснай рэальнасці метадычная навука паступова набліжалася да асэнсавання тэксту і працы з ім як неабходным асяроддзем для навучання мове. Адсутнасць спробы навуковых азначэнняў паняцця *вучэбны тэкст* можна патлумачыць першаснымі даследаваннямі спецыфікі адзінкі. У выніку тэкст падручніка ўсведамляўся як дыдактычны матэрыял для вывучэння і замацавання арфаграфічных і пунктуацыйных правіл. Аспектныя даследаванні вучэбнага тэксту (выхаваўчы характар тэкстаў, развіццёвая функцыя, тыпалогія, псіхолага-педагагічныя патрабаванні і інш.) праводзіліся ў рамках агульнай тэорыі школьнага падручніка і стабільнага статусу тэксту як “асноўнага інструмента навучання ў агульнаадукацыйнай школе” (Д.Д. Зуеў).

Рубежным у развіцці айчыннай лінгваметодыкі выступае найноўшы перыяд, які прыпадае на канец XX – пачатак XXI стагоддзяў і вызначаецца “распрацоўкай першых канцэпцый моўнай адукацыі, адукацыйных стандартаў, новых вучэбных праграм” [3, с. 8]. Перыяд супадае з актыўным даследаваннем пытанняў вучэбнага тэксту – першасна ў рэчышчы развіцця лінгвістыкі тэксту.

Пераломным на гэтым этапе былі змены ў поглядах на ролю тэксту ў працэсе навучання, абумоўленыя развіццём камунікатыўнага накірунку ў лінгвістыцы і фарміраваннем камунікатыўна-дзейнаснага падыходу да навучання беларускай мове (Г.М. Валочка, В. У. Зелянко, Г.М. Малажай, Л.А. Мурына, В.У. Протчанка, В.Ф. Русецкі, М.Г. Яленскі і інш.). Аўтары метадычных прац гэтага перыяду вызначаюць тэкст як прадукт дзейнасці, цэласны маўленчы твор, камунікатыўна абумоўлены рэалізацыяй аўтарскай задумы.

Вылучаны этап неаднародны паводле сутнасці і характару змяненняў, ён вызначаецца поліфанічнасцю метадычных падыходаў да навучання мове. Аднак менавіта з гэтага перыяду вядучай ідэяй урокаў мовы становіцца маўленча-дзейнасны, пазней – кампетэнтнасны вектары развіцця. Менавіта з 90-х гадоў XX ст. у сістэме школьнай моўнай адукацыі тэксту адводзіцца належнае месца. Адпаведна абвешчанай ідэі ў школьныя праграмы і падручнікі ўводзяцца раздзелы “Мова. Маўленне. Тэкст”. Тым самым прызнаецца правамернасць сінтэзу сістэмна-

апісальнага і камунікатыўна-дзейнаснага падыходаў да выкладання беларускай мовы. Кожны з падыходаў быў арыентаваны на комплекснае вырашэнне задач моўнай адукацыі: маўленчае развіццё школьнікаў, выпрацоўка камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Аналіз вучэбнага тэксту як асноўнага кампанента падручніка ў кантэксце перыядаў у развіцці айчыннай лінгваметодыкі дазваляе сцвярджаць наступнае. Доўгі час вучэбны тэкст заставаўся на перыферыі спецыяльных даследаванняў, яго аспекты разглядаліся ў рэчышчы агульнай тэорыі школьнага падручніка, пазней – у сувязі з дасягненнямі лінгвістыкі тэксту. Першасна ў практыцы навучання роднай мове тэрмін *тэкст* пераважна ўспрымаўся ў шырокім значэнні як дыдактычны матэрыял, прызначаны для асэнсавання моўных адзінак у аспекце іх будовы, граматычнага значэння і сінтаксічнай ролі. Пад гэтым паняццем разумеліся не толькі ўласна тэксты, але і групы слоў, словазлучэнняў і сказаў, прызначаных для вырашэння дыдактычных задач.

У працэсе эвалюцыі паняцця тэкст падручніка ўяўляецца дынамічнай сістэмай са зменлівымі тыпалагічнымі асаблівасцямі. Ва ўмовах фарміравання прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучэбны тэкст набывае новае лінгваметадычнае прызначэнне. Ён выступае не толькі інфармацыйна-дзейнасным цэнтрам, але і інтэграваным прадуктам, інструментальным сродкам, які патэнцыяльна ўтрымлівае праграму вырашэння пазнавальных і жыццёвых задач. Змест і структура вучэбнага тэксту аператыўна рэагуюць на новыя адукацыйныя прыярытэты, дасягненні лінгваметодыкі, дэманструюць аксіялагічны, выхаваўчы патэнцыял адзінкі. Зварот на ўроках мовы да арыгінальных вучэбных тэкстаў розных стыляў з’яўляецца, на думку прызнаных педагагічных аўтарытэтаў, прынцыпова новым, сучасным метадычным трэндам.

Такім чынам, вылучэнне этапаў у развіцці лінгваметодыкі праз аналіз станаўлення паняцця *вучэбны тэкст* мае гісторыка-метадалагічную каштоўнасць для захавання пераемнасці айчыннай метадычнай думкі, для фарміравання пазітыўнага ўплыву педагагічнай спадчыны на сучасныя адукацыйныя працэсы. Засваенне метадычных набыткаў папярэднікаў набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах свядомай/несвядомай недаацэнкі айчыннага вопыту, “размывання” традыцыйных адукацыйных каштоўнасцей, неабходнасці пазітыўнага асэнсавання гісторыі нацыянальнай школы, разгортвае станаўленне ўяўленняў аб прадмеце даследавання.

Эвалюцыя статусу абумоўлена зменамі ў агульнатэарэтычных пазіцыях адносна ролі і месца падручніка ў сістэме сродкаў навучання на розных этапах развіцця айчыннай школы. Так, тэксты школьных выданняў *20-х – 30-х гадоў XX ст.* мелі комплексны, надпрадметны характар, адлюстроўвалі эмпірычныя асновы стварэння вучэбных сродкаў. Практычная дзейнасць складальнікаў падручнікаў абумоўлівала характар тэкстаў у форме сціслага апісання – тлумачэння моўных фактаў, з’яў, лаканічных паведамленняў, мастацкіх назіранняў у межах трох тэматычных сфер: прырода, праца, грамадства. У межах гэтага перыяду распачынаецца этап стабілізацыі зместу навучання беларускай мове. Свядомая арыентацыя на калектыўную і самастойную працу вучняў абумовіла з’яўленне новага тыпу падручніка – “Рабочая кніга па мове”, якая акцэнтавала функцыю замацавання і кантролю ў пазнавальнай дзейнасці. Вучэбныя тэксты школьных падручнікаў выступаюць як нарматыўныя, абавязковыя для запамінання і ўзнаўлення. Змест і структура тагачасных выданняў увасабляюць ідэю тоеснасці паміж вывучэннем мовы і граматыкі. У *1940 –1980-я гады XX ст.* знайшла рэалізацыю ідэя стабільнага падручніка па беларускай мове, у рэчышчы якой замацаваўся статус вучэбнага тэксту як першакрыніцы ведаў, сродку фарміравання граматычных і арфаграфічных навыкаў. У цэнтры ўвагі знаходзілася адпаведнасць зместу тэксту дасягненням лінгвістыкі, супастаўляльнае вывучэнне моўных з’яў. У гэтых умовах у поўнай меры актуалізуецца інфармацыйная функцыя вучэбных тэкстаў.

*Этап канца XX – пачатку XXI стагоддзя* ў развіцці айчыннай лінгваметодыкі пазначаны фарміраваннем устойлівага лінгваметадычнага статусу вучэбнага тэксту. Тэкст падручніка як базавы кампанент сучаснай сістэмы адукацыі ўяўляе сабой шматаспектны феномен: канстанта культуры; арыентацыя адзінкі не толькі на ўспрыманне і аналіз, але і на стварэнне ўласных выказванняў праз засваенне вядучых стратэгій тэкставай дзейнасці: ад слова – да тэксту; ад сказа – да тэксту; на аснове тэксту; ад чужога да ўласнага тэксту; ад створанага тэксту – да асобы навучэнца. Аналіз этапаў станаўлення падручніка патрабуе прызнання таго, што метадычная навука заўсёды фарміравалася ў рэчышчы сацыяльна-палітычнага кантэксту, аднак мела ўнутраныя рэзервы, абумоўленыя ўзроўнем дасягненняў лінгвістыкі і педагогікі свайго часу. Гэтая самазначная логіка развіцця дазваляе ўключыць у навуковы актыў практычны вопыт стварэння і ўдасканалення рабочых кніг, стабільных падручнікаў па мове, перспектыўныя лініі ў развіцці ідэй, спраецыраваных на сучасныя набыткі.

Такім чынам, дыялектычныя трансфармацыі тэксту падручніка ў сучаснай адукацыйнай прасторы адбываюцца ў трох аспектах – *зместавым, структурным, функцыянальным. Трансфармацыя зместу* вучэбнага тэксту выдання выяўляецца праз метадычную збалансаванасць інфармацыйна-культуралагічнага, прагматычна-дыдактычнага і выхаваўчага аспектаў, дыверсіфікацыю зместавых і жанравых параметраў адзінкі. *Трансфармацыя структуры* вучэбнага тэксту падручніка абумоўлена нарошчваннем рэфлексійнага кампанента, што патрабуе развіцця ацэначных спосабаў дзейнасці, фармулявання ўласнай пазнавальнай і жыццёвай пазіцыі. *Змены ў функцыях вучэбнага тэксту падручніка* абумоўлены сацыякультурнымі фактарамі развіцця сучаснага грамадства. З улікам новых педагагічных рэалій выданне перажывае мадыфікацыі за кошт *навігацыйнай, даследчай функцый, арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў.* Абнаўленне тэксту школьнай кнігі ў логіцы кампетэнтнаснага падыходу вызначае ў якасці сучасных прыярытэтаў *фарміраванне прадметных і метапрадметных кампетэнцый.*


Спіс цытаваных крыніц:

1. Поршнев, Б.Ф. О начале человеческой истории / Б.Ф. Поршнев. – М.: Мысль, 1994. – 487 с.
2. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі / С.В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 2001. – 160 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Антановіч Н.М. [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Васюковіч, Л.С. Фарміраванне прадметных і метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў сродкамі вучэбнага тэксту: манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 224 с.
5. Тарашкевіч, Б. Беларуская граматыка для школ / Б. Тарашкевіч. – Вільня: Беларус. друкарня імя Скарыны, 1929. – 136 с.
6. Яўневіч, М.С. Беларуская мова: падручнік для 6–7 класаў школ / М.С. Яўневіч, У.К. Андрэенка. – Мінск: Нар. асвета, 1994. – 302 с.



**ГЛАДКАЯ ИРИНА НИКОЛАЕВНА**
Республика Беларусь, Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова


## МЕТОДИКА ПРОВЕДЕНИЯ ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ РАБОТЫ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ

В начальной школе одной из инновационных форм работы является проектная деятельность. При участии учащихся в проектной деятельности хорошо формируется активная творческая позиция учащихся, которая имеет конкретную цель, структуру, направленную на получение желаемого продукта. Организация любой проектной деятельности всегда проходит под началом научного руководителя, тем более в начальной школе, когда ребенок только знакомится с этой сферой.

При выполнении проектной работы учащийся познает для себя различные методы освоения творческой деятельности. Они учатся находить и обрабатывать информацию без помощи старшего, применять полученные знания их различных отраслей, формировать при этом умения и навыки по работе над исследованиями, находить решения поставленных перед ними задач. Существует несколько видов работы, направленной на формирование этих качеств.

Учебный проект организован учителем специально для того, чтобы развивать у учащихся комплекс навыков по самостоятельному решению вопросов, который по итогу завершается созданием творческого продукта.

Если человек может самостоятельно определить план работы и реализовать его, проводить рефлексию над полученным результатом, то можно смело сказать, что он обладает проектным типом мышления.

Исследовательская работа – это проект, который выполняет ребенок под руководством педагога. При разработке такого проекта за начало берется такая модель исследования, которая принята в сфере науки уже достаточно давно. Все этапы развития исследования идут по специально разработанным требованиям.

Цель работы – рассмотреть основные этапы исследовательской работы учащихся начальной школы.